В. В. ТКАЧУК
Іванава, ДУА «Гімназія г. Іванава»

ВІЗУАЛІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Імклівая інфарматызацыя грамадства прывяла да карэнных змен у разнастайных сферах дзейнасці чалавека, у тым ліку спрыяла фарміраванню ў прадстаўнікоў малодшага пакалення новага тыпу мыслення – кліпавага. Так, дзеці, якія выраслі ў эпоху высокіх тэхналогій, па-іншаму глядзяць на свет. Іх успрыманне не паслядоўнае і не тэкставае. Яны бачаць малюнак у цэлым і ўспрымаюць інфармацыю па прынцыпе кліпа.

Безумоўна, у адказ на выклік сучаснага інфармацыйнага свету патрабуюць актуалізацыі традыцыйныя адукацыйныя падыходы. Такім чынам, пры арганізацыі вучэбнага працэсу існуе неабходнасць візуалізацыі інфармацыі. Выкарыстанне падчас заняткаў разнастайных сродкаў і прыёмаў нагляднасці робіць урок больш эфектыўным, таму што дазваляе максімальна задзейнічаць розныя каналы ўспрымання інфармацыі вучняў.

Асноўныя задачы візуалізацыі заключаюцца ў забеспячэнні вобразнага прадстаўлення інфармацыі, лагічнасці пры яе выкладанні, дэманстрацыі ўзаемасувязі паміж тэкстам і яго графічнымі адпаведнікамі.

Неабходна адзначыць, што прыёмы візуалізацыі варта падбіраць з улікам канкрэтных адукацыйных (вучэбных) задач, можна выкарыстоўваць на ўсіх этапах ўрока: пры тлумачэнні новага матэрыялу, пры паўтарэнні, пры замацаванні і г.д.

Існуе шырокая разнастайнасць (палітра, арсенал) традыцыйных спосабаў візуалізацыі на ўроках беларускай мовы і літаратуры: схемы, апорныя канспекты, табліцы, планы, прэзентацыі, відэаролікі і інш.

Аднак сёння з развіццём камп’ютарных тэхналогій набываюць папулярнасць новыя сродкі – інфаграфіка, воблака слоў, калаж, стужка часу, кросэнс і інш.

Напрыклад, падчас вывучэння ў 5 класе тэмы “Тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне” на этапе замацавання ведаў можна прапанаваць вучням працу з воблакам слоў, якое ўтрымлівае ў сабе не толькі тэарэтычныя паняцці, але і варыянты загалоўкаў тэкстаў. Такая падача матэрыялу будзе садзейнічаць засваенню вучнямі адрозненняў тыпаў тэксту, аналітычнаму асэнсаванню загалоўкаў. Дарэчным будзе воблака пры вывучэнні правапісу слоўнікавых слоў (воблака са слоў, вывучаных за год, размежаванне правільна напісаных слоў і з памылкамі і г.д.).

Актуальным з’яўляецца выкарыстанне воблака слоў і на ўроках беларускай літаратуры. Так, у межах тэмы “Якуб Колас. “Крыніца” з мэтай удасканалення аналітычных уменняў пяцікласнікаў у якасці дамашняга задання можна прапаванаваць складанне воблака слоў “Характарыстыка персанажаў”.

З мэтай развіцця лагічнага і творчага мыслення вучняў варта ў сваёй працы выкарыстоўваць кросэнс, які дазваляе хутка і вобразна разгледзець вялікія па памеры тэмы, спрыяе фарміраванню метапрадметных кампетэнцый, адказвае выклікам часу і сучасным патрабаванням да навучальнага працэсу, выклікае інтарэс у вучняў.Так, пры параўнальным аналізе вершаў М. Багадановіча “Зімой” і А. Грачанікава “Зоры спяваюць” мэтазгодна прапаванаваць пяцікаснікам кросэнс. Задача вучняў заключаецца ўпошуку лагічнай сувязі паміж элементамі. Праца з тэматычнымі вобразамі ў дадзеным кантэксце накіравана на развіццё ўмення супастаўляць пейзажныя вершы розных аўтараў, аналізаваць мастацкія вобразы і сродкі яго абмалёўкі.

Такім чынам, візуалізацыя – трэнд сучаснай адукацыі, які дазваляе выпрацоўваць уменне аналізу і разумення тэксту, абагульнення аб’емнай інфармацыі, спрыяе паспяховай сацыялізацыі вучняў.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Варановіч, В.М. Пазнанне, інтэлект, творчасць! // ДУА “Акадэмія паслядыпломнай адукацыі” [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://goo-gl.su/kjEd. – Дата доступу : 19.11.2020.

2. Рощина, И.В. Средства визуализации современного урока языка и литературы // ГУО “Минский областной ИРО” [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://goo-gl.su/P5hp. – Дата доступу : 16.11.2020.